**В. М. СІДАРОВІЧ**

# ГІСТОРЫЯ ВЫВУЧЭННЯ АНТЫЧНЫХ МАНЕТ У БЕЛАРУСІ

Разглядаецца гісторыя вывучэння антычных, у першую чаргу рымскіх, манет, знойдзеных на тэрыторыі Беларусі. Назапашванне звестак пра падобныя знаходкі пачалося яшчэ ў XIX ст. Першыя навуковыя публікацыі па гэтай тэме з'явіліся ў 1930-я гг., а ўжо ў 1960-я гг. да вывучэння знаходак антычных манет далучыўся шэраг савецкіх даследчыкаў. Аднак сапраўднае мэтанакіраванае вывучэнне антычных нумізматычных помнікаў з тэрыторыі Беларусі распачата толькі ў сярэдзіне 1990-х гг. Л. Д. Побалем і з 2007 г. працягнута аўтарам артыкула.

The article describes a history of study of antique and first of all Roman coins found on the territory of Belarus. Accumulation of information about such findings started first in XIX century. Earliest academic papers appeared in 1930s, and in 1960s a number of soviet scientists, including belarussian ones, joined the study of the findings of ancient coins. But a real in-depth analysis of ancient numismatic monuments found in Belarus was started only in the middle of 1990s by L. D. Pobol and since 2007 was continued by the author of the article.

*Ключавыя словы*: гісторыя нумізматыкі; антычныя манеты; знаходкі рымскіх манет; жалезны век Беларусі.

*Keywords*: history of numismatics; antique coins; Roman coin finds; Iron Age of Belarus.

Упершыню дакладныя звесткі пра знаходкі антычных манет на беларускіх землях з'явіліся яшчэ ў XIX ст. Так, у 1814 г. магілёўскім грамадзянскім губернатарам у Эрмітаж быў перададзены скарб з 1815 «дробных срэбраных» манет, які быў знойдзены каля м. Клімавічы [1], а ў ваколіцах Ваўкавыска і каля маёнтка Чахец Пружанскага павета да 1838 г. былі выяўлены рымскія манеты, якія трапілі ў калекцыю М. Булгарына

**Сідаровіч Віталь Міхайлавіч** — загадчык вучэбнай лабараторыі музейнай справы, старшы выкладчык кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. E-mail: wital.sidarowicz@gmail.com

[2]. На працягу апошняй трэці XIX — пачатку XX ст. колькасць зафіксаваных знаходак значна павялічвалася. У вялікай ступені гэта адбывалася дзякуючы актыўнай дзейнасці Імператарскай археалагічнай камісіі (ІАК). Так, у 1873 г. з Мінскага губернскага статыстычнага камітэта ў ІАК быў перададзены манетна-рэчавы скарб з-пад в. Каменка [3], а ў 1900 г. ад гродзенскага губернатара паступіў манетны скарб са Слонімскага павета [4].

Антычныя манеты ўзгадваюцца ў шэрагу археалагічных апісанняў беларускіх губерняў Расійскай імперыі. Так, Г. Х. Татур у характарыстыцы археалагічных помнікаў Мінскай губерні сярод іншых знаходак узгадвае «золотые монеты некоторых римских императоров», «римские (серебряные монеты. — *В. С.*), начиная со времен республики (редко) и дальше многих императоров...», а таксама «греческие, македонские и византийские», у тым ліку «монеты греческих колоний на берегах Черного моря» [5, с. 92, 106, 140, 144]. Аднак ніякіх канкрэтных дадзеных пра гэтыя знаходкі аўтар не прыводзіць. Ф. В. Пакроўскі ўзгадваў пра знаходкі «рымскіх, візантыйскіх і татарскіх манет» у наваколлі Брэст-Літоўска [6, с. 93, п. 107].

Адзначаючы павелічэнне тэмпаў накаплення інфармацыі па антычных манетах з Беларусі ў канцы XIX — пачатку XX ст., трэба канстатаваць, што сапраўднага вывучэння гэтай катэгорыі нумізматычных знаходак яшчэ не было. Нават у навуковых выданнях звесткі пра манеты вельмі сціслыя і маюць у асноўным даведачны характар.

Першая сусветная вайна і рэвалюцыя 1917 г. прывялі да падзення Расійскай імперыі і стварэння на яе нацыянальных ускрайках новых дзяржаў. Беларускія землі былі падзелены паміж СССР і адроджанай польскай дзяржавай. У абедзвюх частках Беларусі паўнавартаснага вывучэння знаходак антычных манет не вялося, але звесткі аб іх час ад часу з'яўляліся ў навуковых і публічных выданнях. Так, у Савецкай Беларусі паведамлялася пра некалькі знаходак. У артыкуле дырэктара Беларускага дзяржаўнага музея П. В. Харламповіча, прысвечаным нумізматычнаму збору музея, узгадваюцца дзве антычныя манеты, знойдзеныя ў Беларусі, — манета Антаніна Пія і баспорскі статар [7, с. 321, 325]. Археолаг С. А. Дубінскі ўзгадваў пра «рымскія і візантыйскія манеты», што былі знойдзены непадалёк ад Маладзечна яшчэ падчас вайны і каля 1928 г. паступілі ў Беларускі дзяржаўны музей [8, с. 45, 46].

Некалькі знаходак антычных манет было зафіксавана ў міжваенны перыяд і ў «польскай» частцы Беларусі. Менавіта з польскімі археола-

гамі варта звязваць пачатак навуковага вывучэння антычных манет на нашых землях. У іх публікацыях упершыню даецца падрабязнае апісанне знаходак. Найбольш цікавым падаецца артыкул В. Антаневіча, у якім даследчык паведаміў пра надзвычай цікавую для Беларусі знаходку залатых манет-медальёнаў — аўрэуса Карына і соліда Валента, якія паходзілі «*z pod Brasławia*» [9, с. 90—93]. Ю. Ядкоўскі паведаміў пра мноства манет, знойдзеных падчас паглыблення рэчышча Нёмана каля Каложскай царквы, сярод якіх былі і рымскія [10, с. 127].

Дзякуючы дзейнасці слонімскага краязнаўца Ю. Стаброўскага сталі вядомымі месцазнаходжанні з Заходняй Беларусі. У 1927 г. ён перадаў у збор Польскага цэнтральнага археалагічнага музея (цяпер Дзяржаўны археалагічны музей) два рымскія дынарыі з-пад в. Кошалева Навагрудскага павета [11, с. 214].

Сапраўднае і паўнавартаснае вывучэнне знаходак антычных манет на тэрыторыі Беларусі распачалося ўжо ў другой палове XX ст. Выбітным савецкім даследчыкам У. У. Крапоткіным упершыню была ажыццёўлена сістэматызацыя знаходак рымскіх манет на тэрыторыі СССР. У шэрагу сваіх публікацый ён узгадвае і беларускія месцазнаходжанні, у тым ліку два скарбы [12, с. 255, 257, 259, 260, 272, 275; 13, с. 102—105; 14, с. 96, 97; 15, с. 95].

Археолаг Ю. У. Кухарэнка сярод знаходак эпохі жалезнага веку з тэрыторыі Палесся ўзгадваў і рымскія манеты з Брэстчыны [16, с. 20, 21]. Амаль праз 20 гадоў у сваёй манаграфіі, прысвечанай першаму даследаванаму ў СССР могільніку вельбарскай культуры Брэст-Трышын, ён апублікаваў дзве манеты з пахаванняў № 11 і № 36 [17, с. 8, 14, 50].

Першымі з беларускіх навукоўцаў увагу на антычныя манеты з тэрыторыі БССР звярнулі Л. Д. Побаль і В. Н. Рабцэвіч. Даследчык жалезнага веку Л. Д. Побаль у 1964 г. упершыню падсумаваў звесткі аб рымскіх манетах з Беларусі [18]. Праз чатыры гады В. Н. Рабцэвіч падрыхтаваў больш грунтоўную зводку па антычных нумізматычных знаходках [19]. Па яго звестках, на 1966 г. з тэрыторыі БССР паходзіла 1968 антычных манет, з якіх абсалютная большасць — 1962 — рымскія. На жаль, у публікацыі В. Н. Рабцэвіча маецца шэраг недакладнасцей або неправераных (нават фантастычных) фактаў. Напрыклад, імператар Феадосій (чыя манета была знойдзена ў Гродне [10, с. 127]) быў «перайменаваны» ім у Тэадорыха I і манета, адпаведна, «стала» остгоцкай [19, с. 189, п. 3].

У 1974 г. крыніцазнаўчая база па знаходках рымскіх манет была папоўнена ўкраінскім даследчыкам У. А. Анохіным, які апублікаваў рэшткі

скарбу (8 дынарыяў), што быў знойдзены ў 1968 г. каля в. Вялікія Жукевічы[1] Бераставіцкага раёна Гродзенскай вобласці [20].

Няма сумневу, што найвялікшы ўнёсак у справу вывучэння антычнай спадчыны Беларусі быў зроблены выдатным айчынным археолагам Л. Д. Побалем. Узгадкі антычных манет з'яўляюцца ў шэрагу яго публікацый яшчэ ў савецкія часы [21; 22], але мэтанакіраванае іх даследаванне Побалем пачынаецца з сярэдзіны 1990-х гг. Большасць публікацый вучонага была прысвечана знаходкам антычных манет у розных рэгіёнах Беларусі [23—28]. Заўважым, што абраны Л. Д. Побалем метад апісання знаходак згодна з адміністрацыйным падзелам (па абласцях) падаецца не надта ўдалым. Больш прыдатным з'яўляецца іх вывучэнне па фізіка-геаграфічных рэгіёнах або басейнах буйнейшых рэк.

Варта таксама адзначыць, што некаторыя са згаданых Л. Д. Побалем месцазнаходжанняў сумнеўныя, бо не падмацаваны адпаведнымі спасылкамі або інтэрпрэтацыя звестак пра іх з'яўляецца занадта вольнай. Да прыкладу, згадваючы пра скарб з в. Шаўры Лідскага павета (цяпер Воранаўскі раён Гродзенскай вобласці), аўтар не падае ніякіх спасылак. Толькі ў тэксце артыкула 2001 г. прысутнічаюць словы «по сведениям Т. Нарбута...» [29, с. 77], але, на жаль, без пазначэння крыніцы. Таксама не бясспрэчнай з'яўляецца лакалізацыя скарбу з-пад в. Каменка Мінскай губерні. Л. Д. Побаль меркаваў, што маецца на ўвазе в. Каменка Кошалеўскага сельсавета Навагрудскага раёна Гродзенскай вобласці. Пры гэтым ён узгадаў даныя з архіва мінскага губернатара [29, с. 76], але зноў без спасылкі на архіўныя справы. Узгадваючы скарб антычных манет, які быццам бы быў знойдзены да 1900 г. каля в. Стражавічы сучаснага Чашніцкага раёна Віцебскай вобласці, Л. Д. Побаль спасылаецца на сведчанне Е. Р. Раманава аб гэтым у «Могилевской старине». Але ў дадзеным творы няма згадак пра знаходку. Магчыма, Л. Д. Побаль вельмі своеасабліва інтэрпрэтаваў наступныя словы выбітнага навукоўца: «...встречалась изгладившаяся от употребления римская или греческая монета или вытравившийся восточный диргем, потерявшие ценность ходячей монеты — мастер (древний ювелир. — *В. С.*) пользовался и ими...» [30, с. 5].

Вельмі важнай справай у нумізматычнай дзейнасці Л. Д. Побаля з'яўляецца пачатак больш дэталёвага вывучэння скарбаў рымскіх манет [29;

---

[1] Некалькі гадоў таму было высветлена, што насамрэч месца выяўлення скарбу знаходзіцца бліжэй да в. Алекшыцы таго ж раёна. Таму скарб атрымаў назву Алекшыцкага.

31; 32]. На жаль, найбольш грунтоўнае яго даследаванне, якое было прысвечана Лышчыцкаму скарбу, не было апублікавана[2].

Да пытання аб знаходках антычных манет у Беларусі звярталіся таксама археолагі С. Я. Рассадзін і М. Ф. Гурын. Першы з іх у межах невялікага артыкула, прысвечанага рымскім імпартам [33], фактычна пералічвае ўжо вядомыя знаходкі, нават не звяртаючы ўвагі на пазнейшыя публікацыі Л. Д. Побаля і паўтараючы памылкі папярэднікаў, напрыклад наконт «браслаўскага» і «стражавіцкага» месцазнаходжанняў. Не пазбаўлены недакладнасцей і памылак і артыкул М. Ф. Гурына [34]. Напрыклад, пазнейшай рымскай манетай на Беларусі ён называў солід Валента (364—378 гг.) [34, с. 69], хоць манета Феадосія (379—395) з Гродна была добра апісана Л. Д. Побалем [28, с. 50]. Абсалютна беспадстаўна М. Ф. Гурын лічыў, што ў знакамітым Клімавіцкім скарбе знаходзіліся манеты 17 імператараў: ад Нервы або Траяна да Аляксандра Севера [34, с. 69], што адназначна з'яўляецца фантазіяй аўтара.

На жаль, падчас правядзення навуковых археалагічных даследаванняў антычныя манеты трапляюцца вельмі рэдка. Тым не менш такія выпадкі ў Беларусі вядомы. Некаторыя з гэтых знаходак апісаны зусім сціпла [35, с. 27, 30; 36, с. 87], іншыя — больш дэталёва [18; 37; 38].

Сярод публікацый, прысвечаных антычным манетам на Беларусі, трэба таксама адзначыць артыкул А. А. Мельнікавай [39], які, на жаль, з'яўляецца не вельмі ўдалай кампіляцыяй ужо вядомай інфармацыі.

З 2007 г. тэма распаўсюджання антычных манет на тэрыторыі Беларусі з'яўляецца прадметам даследаванняў аўтара дадзенага артыкула. Асобная ўвага надаецца дэтальнаму вывучэнню скарбаў [40—45]. Працягваецца даследаванне рэгіянальных асаблівасцей размеркавання знаходак манет, але, у адрозненне ад Л. Д. Побаля, які абапіраўся на сучасны адміністратыўны падзел, намі абрана выкарыстанне басейнаў найбуйнейшых рэк Беларусі як натуральных геаграфічных рэгіёнаў [46; 47]. Улічваючы той факт, што ў эпоху рымскіх уплываў рэкі ў лясной паласе Усходняй Еўропы з'яўляліся асноўнымі гандлёва-транспартнымі артэрыямі, гэта больш адпавядае галоўнай мэце даследавання — суаднясенню знаходак з тымі ці іншымі этнакультурнымі з'явамі. Частка публікацый прысвечана асобным месцазнаходжанням манет — адзінкавым і групавым [48; 49], а таксама такой цікавай групе манет, як грэчаскія і правінцыйна-рымскія [50—52].

[2] Папярэдні варыянт публікацыі захоўваецца ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі.

Пэўны ўнёсак у пашырэнне крыніцазнаўчай базы антычнай нумізматыкі робяць беларускія краязнаўцы. У першую чаргу хочацца адзначыць браслаўчаніна К. Шыдлоўскага, які здолеў знайсці цікавыя дадатковыя звесткі пра незвычайную для Беларусі знаходку залатых манет-медальёнаў [53]. Ён удакладніў лакалізацыю месца знаходкі: не «*z pod Brasławia*», але каля в. Вята Браслаўскага павета (цяпер Міёрскі раён Віцебскай вобласці). Краязнаўцамі з Палесся Ю. Барысюком і С. Янюком была выдадзена брашура, у якой яны сабралі звесткі пра знаходкі рымскіх манет з Брэстчыны [54]. Але відавочна аматарскі характар публікацыі, шматлікія памылкі і сумнеўная даставернасць шэрагу знаходак не дазваляюць выкарыстоўваць гэта выданне як паўнавартасную гістарыяграфічную крыніцу. Пра вельмі цікавую і незвычайную знаходку паведаміў мінскі нумізмат-краязнавец П. І. Горбань. Свой артыкул ён прысвяціў манеце кельтаў-леукаў, якая была знойдзена на Ашмяншчыне [55]. Кельцкія манеты, вядомыя на тэрыторыі Беларусі ўсяго ў некалькіх экзэмплярах, з'яўляюцца аднымі з найстаражытнейшых нумізматычных помнікаў на нашай зямлі.

Зразумела, што вывучэнне распаўсюджання рымскіх манет не можа быць абмежавана тэрыторыяй нейкай краіны. Таму варта прааналізаваць дасягненні даследчыкаў сумежных з Беларуссю краін, тым больш што нярэдка ў іх публікацыях узгадваюцца і беларускія знаходкі.

Сярод нашых суседзяў найбольшае развіццё антычная нумізматыка атрымала ў Польшчы. Да тэмы знаходак антычных (у першую чаргу рымскіх) манет спрычыніліся дзясяткі даследчыкаў. Беларускім знаходкам старажытнагрэчаскіх манет, разам з падобнымі з Польшчы і суседніх рэгіёнаў, прысвяціў увагу ў шэрагу сваіх публікацый знакаміты польскі нумізмат М. Мельчарэк. Ён крытычна разгледзеў даныя аб падобных знаходках, слушна заўважыўшы сумнеўнасць некаторых з іх, напрыклад пталемееўскай манеты «з-пад в. Крыўчыцы Пінскага раёна» [56, с. 31, 32; 57, с. 102], якая насамрэч з'яўляецца антыкварнай падробкай [52, с. 72, 73].

Адным з аўтарытэтных даследчыкаў рымскіх манет на тэрыторыі еўрапейскага Барбарыкума з'яўляецца А. Буршэ. Асаблівую ўвагу ён надае рымска-варварскім кантактам у святле нумізматычных даных [58]. Варта адзначыць, што беларускія знаходкі засталіся па-за ўвагай аўтара. Так, напрыклад, у сваім грунтоўным даследаванні па распаўсюджанні сярод варвараў залатых медальёнаў, у тым ліку манет-падвесак [59], А. Буршэ не згадвае знаходку двух медальёнаў «з-пад Браслава» [9].

Яшчэ адным напрамкам даследаванняў з’яўляецца вывучэнне этнакультурнага аспекту распаўсюджання рымскіх манет. А. Раманоўскі, вывучаючы прысутнасць рымскіх манет у арэале вельбарскай культуры, узгадвае некаторыя беларускія месцазнаходжанні [60, с. 34, 36, 38, 45].

Некалькі рымскіх манет з тэрыторыі Заходняй Беларусі трапілі ў зборы польскіх музеяў і былі апісаны ў каталожных публікацыях. Так, у фондах Археалагічна-этнаграфічнага музея ў Лодзі захоўваюцца дынарыі з-пад Брэста і з Друі [61, с. 40, 41], а ў збор Дзяржаўнага археалагічнага музея (Варшава) яшчэ ў міжваенны перыяд трапілі манеты з-пад вёсак Вераскова і Кашалёва Навагрудскага раёна, а таксама з Пруднікаў Міёрскага раёна [62, с. 281, 284; 63, с. 17, 30, 31].

Тэрыторыя Украіны вельмі моцна, у параўнанні з Беларуссю, насычана знаходкамі антычных манет. Гэтай тэме прысвечаны шэраг публікацый, з якіх варта адзначыць у першую чаргу работы М. Ю. Брайчэўскага [64; 65]. У апошнія гады асноўным даследчыкам распаўсюджання рымскіх манет у арэале чарняхоўскай археалагічнай культуры і прылеглых да яго тэрыторый з’яўляецца К. Мызгін, які распрацоўвае, сярод іншага, шэраг слабадаследаваных тэм, такіх як імітаванне варварамі рымскіх манет [66], распаўсюджанне ва ўсходнееўрапейскім Барбарыкуме эмісій Рымскай Рэспублікі [67] і манет Баспорскага Царства і грэчаскіх правінцый Рымскай імперыі [68; 69], а таксама выкарыстанне манет у якасці ўпрыгажэнняў [70].

Знаходкам рымскіх манет на тэрыторыі Літвы прысвечаны шэраг публікацый выбітнага літоўскага археолага М. Міхельбертаса [71; 72]. Даследуючы жалезны век, ён неаднаразова звяртаўся да тэмы рымскіх імпартаў, у т. л. і манет. Створаны М. Міхельбертасам звод знаходак рымскага імпарта ў Літве [73] дазваляе меркаваць аб заканамернасцях распаўсюджання эмісій Рымскай імперыі не толькі на сучаснай тэрыторыі Літоўскай Рэспублікі, але і ў прылеглых да яе беларускіх рэгіёнах, у першую чаргу ў Панямонні.

Такім чынам, першыя зафіксаваныя звесткі пра знаходкі антычных манет на тэрыторыі Беларусі з’яўляюцца ў XIX ст., але сапраўднае навуковае вывучэнне гэтай катэгорыі нумізматычных артэфактаў пачынаецца ў 1930-х гг. дзякуючы польскім археолагам. На жаль, новыя праявы зацікаўленасці падобнымі знаходкамі мы бачым толькі ў 1960-я гг., але сапраўднае мэтанакіраванае вывучэнне антычных нумізматычных помнікаў з тэрыторыі Беларусі распачата ў сярэдзіне 1990-х гг. Л. Д. Побалем і працягнута ў апошняе дзесяцігоддзе аўтарам гэтага артыкула.

Перад антычнай нумізматыкай у Беларусі стаяць вялікія задачы. Па-першае, гэта поўная каталагізацыя і дэталёвае апісанне ўсіх даступных знаходак (адзінкавых, групавых і скарбаў). Па-другое, гэта вызначэнне тэрытарыяльных асаблівасцей размеркавання знаходак антычных манет, а таксама храналогіі і спосабаў іх паступлення на тэрыторыю Беларусі. Нарэшце, яшчэ адной задачай з'яўляецца высвятленне ролі антычных (у першую чаргу рымскіх) манет у развіцці гандлёвых адносін і зараджэнні грашовага абарачэння на нашых землях. Усе гэтыя задачы могуць быць вырашаны толькі пры ўдзеле шырокага кола даследчыкаў (як беларускіх, так і замежных), нумізматаў, археолагаў і гісторыкаў.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ


1. Архив Государственного Эрмитажа. Ф. 1. Оп. 1. Д. 2 — Кн. поступлений за 1804—1835 гг. Л. 1.
2. РГИА. Ф. 1281. Совет Министров внутренних дел. Оп. 3. Д. 65. Л. 64—65.
3. Архив Института истории материальной культуры Российской Академии наук (далее — ИИМК РАН). Ф. 1. Императорская археологическая комиссия (1859—1917), Российская археологическая комиссия (1918—1919), 1873 г. Д. 11. Л. 13—15.
4. Архив ИИМК РАН. Ф. 1. Императорская археологическая комиссия (1859—1917), Российская археологическая комиссия (1918—1919), 1900 г. Д. 164. Л. 1—6.
5. *Татур Г. Х.* Очерк археологических памятников на пространстве Минской губернии и ее археологическое значение. Минск : Губерн. тип., 1892.
6. *Покровский Ф. В.* Археологическая карта Гродненской губернии. Вильна : Тип. А. Г. Сыркина, 1895.
7. *Харламповіч П.* Монэтныя скарбы, знойдзеныя ў Беларусі, у зборах Беларускага Дзяржаўнага Музэю // Гіст.-археал. зборнік. 1927. № 1. С. 303—343.
8. *Дубінскі С. А.* Бібліографія па археолёгіі Беларусі і сумежных краін = Bibliographie der archäologie Weissrusslands und der Angrenzenden Länder / Беларус. акад. навук, Ін-т гісторыі, сэкцыя археолёгіі. Менск : Друк. Беларус. акад. навук, 1933.
9. *Antoniewicz W.* Notatki archeologiczne // Wiadomości numizmatyczno-archeologiczne. Kraków, 1931. T. XIII. Rocznik, 1930. S. 86—93.
10. *Jodkowski J.* Skarby monet znalezione na terenie województw półn.-wschodnich w latach 1928—1930 (Komunikat Muzeum Państwowego w Grodnie) // Wiadomości numizmatyczno-archeologiczne. Kraków, 1933. T. XIV. Rocznik, 1931 i 1932. S. 126—130.
11. *Jakimowicz R.* Sprawozdanie z działalności Państwowego Muzeum Archeologicznego za 1927 rok // Wiadomości Archeologiczne. V. XIII. 1935. S. 213—232.
12. *Кропоткин В. В.* Клады римских монет в Восточной Европе // Вестн. древ. истории. 1951. № 4. С. 243—281.
13. *Кропоткин В. В.* О некоторых кладах римских монет, найденных в России (из истории русской нумизматики) // Краткие сообщения Ин-та истории материальной культуры. М. ; Л., 1956. Вып. 66. С. 100—106.
14. *Кропоткин В. В.* Клады римских монет на территории СССР. М. : Изд-во Акад. наук СССР, 1961.
15. *Кропоткин В. В.* Новые находки римских монет в СССР // Нумизматика и эпиграфика. 1966. № 6. С. 74—102.

16. *Кухаренко Ю. В.* Памятники железного века на территории Полесья // Археология СССР. Свод археологических источников. М. : Наука, 1961. Вып. Д1-29.

17. *Кухаренко Ю. В.* Могильник Брест — Тришин / Акад. наук СССР, Ин-т археологии. М. : Наука, 1980.

18. *Побаль Л. Д.* Рымскія манеты на тэрыторыі БССР // Вес. Акад. навук БССР. Сер. грамад. навук. 1964. № 2. С. 127—128.

19. *Рябцевич В. Н.* Находки античных монет на территории Белоруссии // Вопросы истории : сб. ст. молодых ученых и аспирантов / под ред.: Т. Е. Дударевой, Д. Б. Мельцера. Минск : Высш. шк., 1968. С. 187—192.

20. *Анохін У. А.* Скарб рымскіх манет з вёскі В. Жукевічы // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1974. № 3. С. 23—25.

21. *Поболь Л. Д.* Древности Белоруссии в музеях Польши. Минск : Наука и техника, 1979.

22. *Поболь Л. Д.* Археологические памятники Белоруссии. Железный век. Минск : Наука и техника, 1983.

23. *Побаль Л. Д.* Антычныя знаходкі ў Мінскай вобласці // Беларус. гіст. часоп. 1993. № 4. С. 28—32.

24. *Побаль Л.* Прывітанне з далёкай мінуўшчыны // Беларус. думка. 1995. № 6. С. 24—26.

25. *Побаль Л. Д.* Магілёўшчына і антычны свет: аналіз нумізматычна-археалагічных крыніц // Гістарычныя лёсы Верхняга Падняпроўя : матэрыялы рэгіян. навук. канф. : у 2 ч. / рэд. савет: С. І. Бяспанскі (адк. рэд.) [і інш.]. Магілёў : Облтипография, 1995. Ч. I : Археалогія. С. 181—188.

26. *Побаль Л.* Антычныя нумізматычныя багацці Міншчыны і Віцебшчыны // Беларус. гіст. часоп. 1996. № 1. С. 115—125.

27. *Побаль Л.* Антычныя багацці Брэста і яго наваколля // Беларус. гіст. часоп. 1998. № 3. С. 60—65.

28. *Побаль Л.* Антычныя грошы ў Гродзенскім Панямонні // Беларус. гіст. часоп. 1999. № 2. С. 49—52.

29. *Поболь Л. Д.* Находки римских монет на землях Беларуси // Lietuvos Archeologija. 2001. Т. 21. С. 73—80.

30. *Романов Е.* Археологические находки // Могилевская старина : сб. ст. / под ред. Е. Р. Романова. Могилев : Тип. губерн. правления, 1900. Вып. 1 : 1898 и 1899 гг. С. 5—6.

31. *Побаль Л.* Новы скарб рымскіх сярэбраных манет з Беларусі // Час, помнікі, людзі. Памяці рэпрэсаваных археолагаў : тэз. дакл. міжнар. канф., Мінск, 27—30 кастр. 1993 г. Мінск : Выд-ва Ін-та гісторыі, АН Беларусі, 1993. С. 180.

32. *Побаль Л. Д.* Скарб рымскіх манет з Жалудка // Шчучыншчына: мінулае і сучаснасць : матэрыялы навук.-практ. краязн. канф., прысвеч. знакамітым людзям, помнікам гісторыі і культуры, гістарычным падзеям і мясцінам Шчучыншчыны. Ліда : Лід. друк., 1997. С. 42—45.

33. *Rassadin S.* Zur Frage der römischen Importe in Weißrußland // Germania. 2000. Jahrgang 78. H. 2. S. 392—416.

34. *Гурын М. Ф.* Антычны імпарт на тэрыторыі Беларусі // Гіст.-археал. зб. 2002. № 17. С. 65—72.

35. *Ильютик А. В.* Селище Дедново на Березине // Старажытнасці Бабруйшчыны. Бабруйск, 1998. С. 26—42.

36. *Лошенков М. И.* Михалевское городище // Старажытнасці Бабруйшчыны. Бабруйск, 1998. С. 83—104.

37. *Белявец В.*, *Сідаровіч В.* Дэнарый Рымскай рэспублікі з паселішча Несвіло Брэсцкага раёна // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. 2009. Вып. 17. С. 160.

38. *Зайкоўскі Э.*, *Сідаровіч В.* Рымскія манеты з селішча Некасецк // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. 2011. Вып. 20. С. 418—419.

39. *Мельникова А. А.* Находки монет античного мира в Беларуси // Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны. Мінск : БДУ, 2008. Вып. 4. С. 67—76.

40. *Сідаровіч В.* Дэнарыі імператрыцы Сабіны са скарбу з-пад вёскі Малеч // Acta Archaeologica Albaruthenica. Мінск, 2007. Vol. 1. С. 104—109.

41. *Сидорович В. М.* Редкие римские денарии Малечского клада // XIV Всерос. нумизмат. конф. : тез. докл. и сообщ., Санкт-Петербург, Гатчина (Россия), 16—21 апр. 2007. СПб. : Изд-во Гос. Эрмитажа, 2007. С. 36—38.

42. *Сидорович В.* Лыщицкий клад римских монет // XV Всерос. нумизмат. конф. : тез. докл. и сообщ., Ростов-на-Дону, 20—25 апр. 2009. М. : Нумизмат. лит., 2009. С. 44—45.

43. *Сідаровіч В.* Скарб рымскіх манет з-пад вёскі Ставішча Брэсцкага раёна // Studia Numismatica Albaruthenica. Мінск, 2011. Vol. I. С. 41—48.

44. *Сидорович В.* Малечский клад римских денариев (основные итоги исследования) // Pieniądz i sistemy monetarne — wspólne dziedzictwo Europy : studia i materiały: Białoruś — Bułgaria — Litwa — Łotwa — Mołdawia — Polska — Rosja — Rumunia — Słowacja — Ukraina / red.: K. Filipow, B. Kuklik. Augustów — Warszawa, 2012. S. 29—35.

45. *Sidarovich V.* A hoard of Alexandrian Tetradrachms from the Last Quarter of the 3rd Century AD Found in the Upper Neman Region // Notae Numismaticae — Zapiski Numizmatyczne. 2013. Vol. VIII. P. 173—184.

46. *Сидорович В.* Новые находки античных монет в Белорусском Понеманье // Pieniądz — Symbol — Władza — Wojna. Wspólne dziedzictwo Europy : studia i materiały: Białoruś — Estonia — Litwa — Łotwa — Polska — Rosja — Rumunia — Słowacja — Ukraina / red.: K. Filipow, B. Kuklik. Augustów — Warszawa, 2010. S. 42—52.

47. *Сидорович В.* Белорусское Побужье в период римских влияний в свете нумизматических находок // Деньги и их место в истории общества: междунар. нумизмат. симпоз. : тез. докл., Кремница, Словакия, 20—23 мая 2010 г. Кремница. 2010. С. 16—17.

48. *Сидорович В.* Находки римских монет середины 3—4 вв. на территории Беларуси // Numizmatika. 2008. № 22. S. 8—13.

49. *Сидорович В.* Случайные находки античных монет на территории Беларуси в 1970-е — 2007 г. // Случайные находки: хронология, атрибуция, историко-культурный контекст : материалы тематич. науч. конф., Санкт-Петербург, 16—19 дек. 2008 г. СПб., 2008. С. 172—176.

50. *Сидорович В.* Находки монет античной Греции на территории Беларуси // XVI всероссийская нумизматическая конференция : тез. докл. и сообщ., Санкт-Петербург, 18—23 апр. 2011 г. СПб. : Изд-во Гос. Эрмитажа, 2011. С. 25—26.

51. *Sidarovich V.* Roman provincial coins in Belarus: on the issue of mode and time of penetration of autonomous coinages into East European Barbaricum // Money, Economy and Society. Intern. numismat. sympos., Košice, May 16—19, 2013. Košice, 2013. P. 34—35.

52. *Sidarovich V.* The Finds of Greek and Roman Provincial coins in Belarus // Notae Numismaticae — Zapiski Numizmatyczne. 2014. Vol. IX. S. 71—94.

53. *Шыдлоўскі К.* Удакладненне наконт адной нумізматычнай знаходкі // Браслаўскія сшыткі : гіст. зб. 1996. № 1. С. 29—30.

54. *Борисюк Ю. А.*, *Янюк С. М.* Римские монеты на территории Брестской области. Клады и единичные находки. Минск, 2013.

55. *Горбань П.* О находке монеты кельтской Галлии на территории Беларуси // Банк. весн. 2014. № 3. С. 11—12.

56. *Mielczarek M.* Antyczne monety greckie odkryte na ziemiach Polski, Litwy, Białorusi i Zachodniej Ukrainy // Białoruś, Litwa, Polska, Ukraina — wspólne dzieje pieniądza : Materiały z I Międzynar. konf. Numizmat., Suprasl, 20—22.X.1994. Warszawa, 1996. S. 31—37.

57. *Mielczarek M.* Ancient Greek coins found in Central, Eastern, and Northern Europe. Wrocław : Wyd. Polsk. Akad. Nauk, 1989.

58. *Bursche A.* Later Roman-Barbarian Contacts in Central Europe: Numismatic Evidence. Berlin : Gebr. Mann, 1996.

59. *Bursche A.* Złote medaliony rzymskie w Barbaricum. Symbolika prestiżu i władzy społeczeństw barbarzyńskich u schyłku starożytności / Światowit. Supplement Series A: Antiquity. Warszawa, 1998. Vol. II.

60. *Romanowski A.* Znaleziska monet rzymskich z terenów kultury wielbarskiej na Podlasiu, prawobrzeżnym Mazowszu i zachodniej Białorusi // Wiadomości Numizmatyczne. Rok LI (2007). Z. 1 (183). S. 29—51.

61. *Gupieniec A.* Przewodnik po dziale numizmatycznym muzeum archeologicznego w Łodzi. Łódz : Wyd. Muzeum Archeologicznego w Łodzi, 1954.

62. *Kietlińska A.* Monety starożytne w zbiorach Państwowego Muzeum Archeologicznego w Warszawie // Materiały Starożytne. Warszawa, 1957. T. II. S. 269—291.

63. Zabytki z okresu wpływów rzymskich, średniowiecza i czasów nowożytnych z Białorusi w zbiorach Państwowego Muzeum Archeologicznego w Warszawe / J. Andrzejowski [ta in.] ; pod red. A. Piotrowskiego. Warszawa : PMA, 2005.

64. *Брайчевский М. Ю.* О распространении римских монет у древних восточных славян // Вестн. древ. ист. 1954. № 1. С. 119—134.

65. *Брайчевський М. Ю.* Римська монета на території України. Київ : Вид-во АН УРСР, 1959.

66. *Мызгин К. В.* «Варварские» подражания римским монетам на территории черняховской культуры // Древности. Харьков : НТМТ, 2009. С. 90—106.

67. *Мызгин К. В.* Находки римских республиканских монет на юге Восточной Европы // Stratum plus. 2012. № 4. С. 17—30.

68. *Мызгин К. В.* Находки римских монет провинциальной малоазийской чеканки II—III вв. на территории черняховской культуры // Древнее Причерноморье. Одесса, 2011. Вып. IX. С. 321—328.

69. *Myzgin K.*, *Beidin G.* Findings of Bosporan coins on the territory of Chernyakhov Culture // Notae Numismaticae — Zapiski Numizmatyczne. 2012. Vol. VII. P. 45—79.

70. *Мызгин К. В.* Подвески из римских монет в ареале черняховской культуры восточнее р. Прут // Лесная и лесостепная зоны Восточной Европы в эпохи римских влияний и Великого переселения народов : материалы конф., Тула, нояб. 2008 г. : в 2 ч. Тула : Гос. музей-заповедник «Куликово поле», 2010. Ч. 2. С. 95—114.

71. *Michelbertas M.* Romos monetř radiniai Lietuvos TSR teritorijoje // Lietuvos TSR Mokslř Akademijos darbai. A serija. 1961. T. 1. P. 19—36.

72. *Михельбертас М. М.* Тезаврирование римских монет на территории Литвы // Pieniądz i banki: tezauryzacja, obieg pieniężny, bankowość: wspólnota dziejów: Białoruś — Litwa-Łotwa — Polska — Słowacja — Ukraina. 5th Międzynar. konf. numizmat., Supraśl, 5—7.IX.2002. Warszawa, 2002. S. 77—82.

73. *Michelbertas M.* Corpus der römischen Funde im europäischen Barbaricum. Litauen. Vilnius : Habelt, 2001.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 10 чэрвеня 2015 г.